

*Урыцкі народны ансамбль народнай песні «Скарыначка».*

Заснаваны ў 1984, з 1990 народны. Кіраўнік — В.Кавалёў. У склад ансамбля ўваходзяць вакальная, танцавальная і інструментальная (скрыпка, цымбалы, баян, бубен, трашчоткі, вясельны барабан, кантрабас) групы. У рэпертуары песенны («Ой, позна, позна», «Ехаў Яська з поля» і інш.) і танцавальны («Урыцкая полька», «Карапэт», «Нарэчанька» і інш.) фальклор Гомельшчыны, апрацоўкі бел. нар. песень («Вясёлая старонка», «У нашым у сяле», «Дзеўкі, бабы па грыбы хадзілі», «Каля саду каліна», «А я бачыў, бачыў», «Ой, думаў я», «Чэраз рэчаньку, чэраз балота», «У нашай вёсцы»). Паставіў мясцовыя абрады Каляды, Гуканне вясны, Купалле, Вяселле. Калектыў — удзельнік Міжнароднага фестывалю нар. музыкі «Звіняць цымбалы і гармонік» (г. Паставы, 1996), Усебеларускага фестывалю нац. культур (Гродна, 2004) і інш.

*А.І.Гурчанка.*

**УСХО́Д І ЗА́ХАД СО́НЦА**. У традыцыйных светапоглядных уяўленнях беларусаў гэта бінарная апазіцыя надзялялася самым высокім статусам сакралізацыі. У сістэме ўспрыняцця і разумення часу яна суадносіцца з двума асноўнымі перыядамі часазлічэння — годам і днём (якія адпавядаюць руху сонца), а таксама месяцам і тыднем (рытм якіх задаюць фазы месяца). Калі ўсход сонца характарызаваўся станоўшчам спакою, ураўнаважанасці і суразмеранасці, знаменаваў сабою пачатак стварэння свету, то захад сонца сімвалізаваў пераходную фазу, для якой характэрна няпэўнасць, памежнасць, адкрытасць. Гэтыя каштоўнасныя характарыстыкі і прадвызначылі стаўленне продкаў да адзначаных ключавых момантаў у структуры сутак.

Усход сонца лічылі найбольш спрыяльным часам для выканання розных абрадавых дзеянняў прадуцыравальнай і прафілактычнай накіраванасці, рытуалаў з вобласці сакральна-магічнай практыкі. Ад інфарматараў 19—20 ст. вядома, што лячэбныя сеансы праводзілі на У. і з. с. Напрыклад, нагаворную ваду давалі «хвораму піць і мачыць грудзі сем дзён на зары ранішняй і вячэрняй»; пры лячэнні курынай слепаты трэба «перад усходам, на заходзе сонца і зноў назаўтра перад усходам узлазіць на вароты і гучна тройчы за кожным разам заспяваць: «Кукарэку, заспяваю, хто пачуе, то — таму». Лічылі, што станоўчым эфектам уздзеяння валодаюць невялікія прамежкі часу да ўсходу сонца і пасля яго (для магічных дзеянняў выкарыстоўвалі ваду, узятую з калодзежа на Вадохрышча паміж 4 і 6 гадзінамі). Асаблівым рытуальным статусам надзялялі ўсход сонца ў дні вялікіх каляндарных свят. Найбольш аздараўленчай была «непачатая вада», узятая ў Чысты чацвер перад усходам сонца. Існавалі павер'і, што гэты час спрыяе найбольш эфектыўнаму выкананню асобных гаспадарчых спраў. На ранішняй зорцы спяшаліся ў поле, каб першымі распачаць сяўбу яравых, тым самым спадзеючыся на асаблівую ўрадлівасць глебы. Некаторыя гаспадыні саджалі расаду капусты яшчэ да ўсходу сонца, «прапускалі» праз дым растопленай печы галоўкі цыбулі, спадзеючыся, што гэта ўратуе яе ад шкоднікаў і паспрыяе добраму росту. Каб ураджай гародніны быў добры, раз у год (7 ліпеня) перад усходам сонца жанчыны выконвалі рытуальнае дзеянне: распускалі валасы і ў адным споднім тройчы аббягалі свае грады, садзіліся пасярод агарода, заплятали касу, абкручвалі яе вакол галавы і завязвалі хусціну. Раніцай на Каляды выграбалі з печы по-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пел і пасыпалі ім вакол кожнага садовага дрэва, каб быў багаты ўраджай. На Юр'я на ўсходзе сонца выконвалі абрад Абходу нівы. Гаспадар браў каравай, ішоў да жытнёвай паласы, ставіў хлеб у жыта і супастаўляў, што вышэй. Калі жыта вышэй — чакалі добры ўраджай і наадварот. Па асаблівасцях усходу сонца прадказвалі надвор'е на бліжэйшы час: з'яўленне вясёлкі было знакам працяглага пахмурнага надвор'я. Надзвычай выключны статус гэты час атрымаў у чарадзейных казках. Калі вечарам герою даручалі, здавалася б, непасільнае заданне, то яго чароўныя памочнікі (сястра або жонка) раілі: кладзіся спаць — раніца мудрэй за вечар. Сапраўды, раніцай герой абавязкова выконваў заданне цара. У паэтыцы бел. замоў усход сонца (зоры-зараніцы) займае выключнае месца і пазначаны «лепшым часам»: «Першым разам, лепшым часам Госпаду Богу памалюся, Святой Прачыстай пакланюся. Зоры-зараніцы, Божыя памачніцы, прыступіце. Першым разам, лепшым часам...».

Захад сонца — перыяд пераходу з дня ў ноч. Існаваў шэраг рэгламентуючых і нават забараняючых правіл у абрадавых і побытавых паводзінах продкаў. Лічылася, што любая гаспадарчая дзейнасць павінна быць завершана да заходу сонца. Вечарам нельга было саджаць, касіць, складваць дровы, месці двор і хату, забаранялася прадаваць або купляць хатнюю жывёлу, класціся спаць даросламу чалавеку і асабліва дзіцяці. Дажынкі таксама завяршалі да заходу сонца, бо верылі, што зямля можа страціць сваю ўрадлівасць. Бел. сялянкі не расчэсвалі валасы вечарам у вялікія святы і напярэдадні іх, бо баяліся, што хутка памрэ муж. У нар. метэаралогіі захад сонца лічыўся даволі дакладным індыкатарам-прадказальнікам стану надвор'я на наступны дзень: калі на захадзе сонца хмары чырванеюць, заўтрашні дзень будзе ветраным; калі вечарам «вельмі лагоднае паветра» або адсутнічае раса, то назаўтра будзе дождж; калі рыба ўвечары гуляе і высока скача над вадой — да дажджу. Калі адвячоркам певень пракукарэкае цотную колькасць разоў — будзе добрае надвор'е, калі няцотную — чакалі вялікага ветру і дажджу або снегу. Дзяцей, народжаных у другой палавіне дня («паўдзён») і асабліва на захадзе сонца, лічылі недаўгавечнымі і нешчаслівымі. Рытуальныя дзеянні, звязаныя з любоўнай магіяй, як правіла, выконвалі на захадзе сонца.

*Літ.*: Крук Я. Сімволіка беларускай народнай культуры. Мн., 2001; Крук Я., Котович О. Колесо времени: традиции и современность. Мн., 2003. С. 72—98; Полесские заговоры. М., 2003.

*А. В. Катовіч.*

**«УСЯВЕ́Д»**(«Знахар»), казачны сюжэт СУС 1641. Вядомы ў бел. фальклоры ў шматлікіх варыянтах. Сюжэт «У.» уваходзіць у казкі са зборнікаў Л.Барага, У.Дабравольскага, О.Кольберга, Е.Раманава, М.Федароўскага, П.Шэйна. Знахар знаходзіць каня, якога сам або разам з памочнікам схаваў і робіцца вядомым, павінен адшукаць у цара (пана) прапаўшую каштоўнасць (жамчужыну, пярсцёнак), выпадкова называе імёны зладзеяў, якія ідуць да яго з пакаяннем, каштоўнасці вяртаюцца ўладальніку. Усявед угадвае, што ў цара ў кулаку («Папаўся жучок цару ў кулачок») або ў місцы («Заляцела варона ў высокія харомы»). У казцы са зборніка «Матэрыялы па этнаграфіі Гродзенскай губерні» Е.Раманава (вып. 2, 1912) знахар лічыць, колькі разоў спявае певень, выпадкова адгадвае колькасць зладзеяў, якія спалохаліся і прызналіся, што ўкралі ў цара пярсцёнак. Ён паказвае, дзе шукаць яго каштоўнасць. Цар на прагулцы ў садзе ўзяў у руку жучка і праверыў, ці адгадае знахар. Той, не ведаючы, што ў руцэ, сказаў пра сябе: «От папаўся жучок у рукі цару — цяпер не выскачыш!» — і нечакана адгадаў, за што цар «яго нагрядзіў». Найбольшварыянтаў сюжэта «У.» апублікаваў П.Шэйн. У казцы «Дзед злодзей, баба варажбітка» дзед украў у суседа нарогі (сашнік), падаткнуў у яго пад страхою, а баба Хаўронння, жонка дзеда, узялася адгадаць, дзе нарогі: «воду ліла ў дванаццаць місак, вузлы на вяроўцы вязала» і нарэшце сказала, што нарогі пад страхою хлява. Баба «адгадала» таксама, дзе вол, украдзены дзедам, і дзе схаваны панскія грошы. Баба атрымала ад пана шмат грошай. У адрозненне ад іншых казак з такім сюжэтам бабу-варажбітку рабуюць фурман і «лёкай», калі вязуць яе ад пана дадому. Адбіраюць грошы і пакідаюць у лесе, дзе яна гіне. Трагічна заканчваецца зладзейства і для дзеда: яго злавілі, калі краў, пасадзілі ў турму, у якой ён памёр. У іншых варыянтах

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ